УДК 81’373=161.3
ББК 81.411.3

# ПАШПАРТ У ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСАЎ

**А.В. Макарэвіч**
к.філ.н., дацэнт
(Беларусь, Брэст, БрГУ імя Пушкіна)

**Анатацыя**

У дадзеным артыкуле аналізуецца пашпартная сістэма ў Беларусі. Першапачаткова зазначана, што продкі беларусаў выкарыстоўвалі назвы “глейт”, “ліст”, “білет” и др. У пачатку ХХ стагоддзя пачалі выкарыстоўваць слова “пашпарт”.

**Ключавыя словы:**
пашпарт, сістема, ліст, білет, афіцыйны дакумент

У наш час пашпартная тэрміналогія ў асноўным стандартызаваная па ўсім свеце. Пашпарты бываюць: звычайны, турыстычны, службовы, дыпламатычны, часовы ці “аварыйны”, пашпарт марака, калектыўны, сямейны і інш. Лічыцца, што пашпарт мае італьянскія ці французскія карані і абазначае старажытны дакумент для праходу праз марскі порт. Насамрэч больш дакладна гаварыць, гэта дакумент для праходу праз дзверы ці вароты ў гарадской сцяне, бо французскае слова porte абазначае менавіта “дзверы”. Паводле “Слоўніка іншамоўных слоў” А. Булыкі, лексема “пашпарт” запазычана з французскай мовы праз польскую і мае значэнні: “пашпарт (польск. passport ад фр. passeport, ад pass = праход + port = гавань, першапачаткова – дазвол на адплыццё) :

– 1) афіцыйны дакумент устаноўленага ўзору, які засведчвае асобу яго ўладальніка; 2) пасведчанне з асноўнымі звесткамі аб якой-н. машыне, абсталяванні” (т. 2, с.183).

У Вялікім Княстве Літоўскім у якасці афіцыйнага дакумента выкарыстоўвалі назву глейт. “Старабеларускі лексікон” М. Прыгодзіча і Г. Цівановай падае: “кглейтъ 1. Ахоўная грамата, пропуск для праезду па пэўнай тэрыторыі…” (с. 95). Нашы продкі таксама ўжывалі найменне ліст.

У Расійскай імперыі (Беларусь знаходзілася ў яе складзе) грамадзянам выдавалі дакумент, які засведчваў асобу і даваў права на жыхарства – білет.

Асобыя пашпарты мелі тагачасныя прадстаўнікі малога і сярэдняга бізнесу. На працягу амаль усяго ХІХ ст. у Расіі тым, хто займаўся прадпрымальніцкай дзейнасцю, выдавалі адрасны білет. Свае пашпарты мелі і прадстаўніцы адной з самых старажытных “прафесій”. Блудніцы (прастытуткі) атрымлівалі пашпарт, зроблены з нізкаякаснай паперы жаўтаватага колеру, таму ў народзе ён атрымаў назву жоўты білет: “*Дочь моя по желтому билету живет-с…*” (Дастаеўскі “Злачынства і пакаранне”).

Функцыю пашпарта, на наш погляд, выконвала вольная – дакумент, з якім раней адпускалі прыгонных на волю. У гэтай якасці ўжывалася і назва від.

З пашпартам беларусы сталі жыць толькі ў XX стагоддзі. У пачатку XX ст. людзям было складана выехаць з Беларусі за мяжу, напрыклад, у заработкі. Неабходна было мець замежны пашпарт. Рэдактары ў дваццатым нумары газеты "Наша ніва" за 1908 год змясцілі такі матэрыял: "За границаю людзи нияк ня могуць зразумець, на што ў Расеи заведзены пашпорты, каторые только агранечваюць свабоду расейских падданых и затрымоўваюць гандэль… "Культурные и нават некультурные чужаземцы кажуць аб нашых пашпортах и сьвятах з усьмешкаю и с пагардаю". "Пашпорты ў Расеи трэба саўсим скасаваць. Труднасць дастаць заграничны пашпорт и вяликая цэна яго вельми прашкаджаюць купцом расейским вясьци гандэль з границаю и саўсим не даюць дробным гандляром и рэмесником нашым працаваць за границаю. Гэтак сама ясна паказана, што карысьци ад пашпортоў нима ниякой никому; а и рэволюционэры спакойне жывуць у Расеи, маючы або чужаземные пашпорты, або фальшывые расейские. Пашпорты аджыли ўжо свой век, і іх трэба скасаваць. А якая балячка для ўсих нас, а найбольш для людзей бедных тые пашпорты, ведае кожны, каму прыходзилося абиваць за ими пароги воласьци, палицэйских участкоў и т.д. – Дык можна мець надзею, што кали Дума возьмецца за справу аб пашпорты, то и ўсе падданые расейские будуць з ёю, и правицельство ня так будзе працивицца скасаванню гэтай народнай балячки. Паспорт заграничны каштуе 16 руб. ды и дастаць яго шмат клопатау. У нас можэ большы быу бы гандэль з Немцами, можэ и мужыки ездзили б туды на работу у летку. Напрыклад, ад Вильни да Немецкаго царства (да Вержбалова) ехаць вагонам 3 гадзины 19 мин., а ад Вержбалова да Бэрлина (сталицы немецкай) ехаць ешчэ 12 гад. А ад Вильни да Минска 6 гад. язды. Каб пераехаць, напрыклад, з немецчыны да Аустрыи, ня трэба мець ниякого пашпорта и никого не пытацца, усе роўна як з Смаргони у Ошмяну" [с. 2].

У гады Першай сусветнай вайны на акупаванай немцамі тэрыторыі Беларусі выдаваліся дзвухмоўныя нямецка-беларускія пашпарты.

Грамадзяне абвешчанай 25 сакавіка 1918 года Беларускай Народнай Рэспублікі атрымлівалі пашпарты з "Пагоняй", у тым ліку і дыпламатычныя.

У БССР савецкі пашпарт пачаў уводзіцца для больш строгага парадку ўліку і кантролю ў 30-я гады XX ст. Пашпартная сістэма была зацверджана пастановай ЦВК і СНК СССР ад 27.12. 1932 г. Аднак паводле пастановы ЦВК і СНК СССР ад 27 снежня 1932 г. №57/1917 "Аб устанаўленні адзінай пашпартнай сістэмы ў Саюзе ССР і абавязковай прапіскі пашпартоў" і пастановы СНК СССР ад 28 красавіка 1933 г. № 861 "Аб выдачы грамадзянам Саюза ССР пашпартоў на тэрыторыі СССР" пашпартызацыя на калгаснікаў не распаўсюджвалася, і яны не атрымлівалі пашпартоў. Гэта прывяло да істотнага абмежавання права калгаснікаў на працу.

Калгаснік не мог па сваёй ініцыятыве не толькі перавесціся на іншае прадпрыемства, але і звольніцца па ўласным жаданні і ўладкавацца на новую працу, паколькі прыём на працу без пашпарта быў забаронены. Паводле пастановы СНК СССР ад 19 верасня 1934 г. № 2193 "Аб прапісцы пашпартоў калгаснікаў-адыходнікаў, якія паступаюць на працу ў прадпрыемствы без дагавораў з гаспадарчымі органамі" ў пашпартызаваных мясцовасцях прадпрыемствы маглі прымаць на працу калгаснікаў толькі пры наяўнасці ў іх пашпартоў, атрыманых па ранейшым месцы жыхарства, і даведкі ад праўлення калгаса пра яго згоду на адыход калгасніка. Як дакладна адзначае О. М. Вярбіцкая, склалася сістэма пазаэканамічнага прымацавання сялян да калгасаў. Гэта сістэма, якая шмат у чым нагадвае прыгоннае права, праіснавала да канца 1950-х гг., калі пачалася паступовая пашпартызацыя сельскага насельніцтва. Напрыклад, мой бацька Макарэвіч Васіль Дзмітрыевіч (1932 г.н.) згадвае, што толькі з дазволу старшыні калгаса можна было знайсці працу ў горадзе: "*Нада была спраўка, што прадсядацель калхоза адпускае цябе на работу ў Вацэвічы*" (г. Івацэвічы)".

Канчаткова пашпарты сталі выдавацца ўсім грамадзянам, уключаючы жыхароў сяла і калгаснікаў, толькі з прыняццем пастановы Савета Міністраў СССР ад 28 жніўня 1974 г. № 677 "Аб зацвярджэнні Палажэння аб пашпартнай сістэме ў СССР".

"За савецкім часам, адзначае Алена Ціхановіч у "Слоўніку Свабоды", шматлікія пашпартысты і пашпартысткі на сваіх пашпартных сталах вялі заўзятую перакоўку ўсіх нацыянальных традыцый іменаслову на адзін лад: так нарадзіліся раней нечуваныя звароты "Нурсултан Абішэвіч" ці "Ўрал Рамдракавіч". Так і беларускі Янка, ці Ян, застаўся толькі ў песні. Савецкі пашпарт, як і мараль, меў двайное аблічча: адзін нутраны, другі – замежны. Даўно заўважана: чырвоны пашпарт памежнікі ў Еўропе бяруць, як жабу" [с.294–295].

З 1993 па 1996 гг. герб "Пагоня" ўпрыгожваў пашпартныя вокладкі беларусаў. Пашпарт з "Пагоняй", на думку Алены Ціхановіч, не паспеў стаць пазнавальным на межах. Але тыя, хто яго прыхаваў, берагуць для XXI стагоддзя.

Такім чынам, прааналізаваны матэрыял сведчыць, пашпартная тэрміналогія ў гісторыі Беларусі мае адметны шлях. Першапачаткова нашы продкі ў якасці афіцыйнага дакумента ўстаноўленага ўзору, які засведчваў асобу ўладальніка, выкарыстоўвалі назвы глейт, ліст, білет і інш. У пачатку XX стагоддзя ў беларускай мове замацавалася слова пашпарт. Канчаткова пашпартная сістэма ў Беларусі склалася ў другой палове 70-х гадоў XX стагоддзя.